## Інтэлектуальны турнір "Мая Беларусь" для мудрых людзей (Ашмяны - Смаргонь)

У г. Смаргонь на інтэлектуальным рынгу сустрэліся дзве каманды залатога ўзросту. Гэта была сустрэча двух аддзяленняў дзённага знаходжання для грамадзян сталага ўзросту Ашмянскага і Смаргоньскага раёна. Яна была накіравана на супрацоўніцтва двух раёнаў і падтрымку актыўнай жыццёвай пазіцыі людзей сталага ўзросту. Гульня была напоўнена запалам і духам спаборніцтва. Інтэлектуальны турнір парадаваў магчымасцю атрымаць новыя веды аб нашай роднай Беларусі, прынёс новыя знаёмствы, пазнаёміў з творчасцю нашых суседзяў. Усе ўдзельнікі гульні атрымалі граматы і каштоўныя падарункі, мора пазітыву і велізарны зарад бадзёрасці. Перамагла дружба!



